Усяго некалькі дзён застаецца да Калядаў. Пухкія сняжынкі замятаюць падворак. У маленькім дамку свеціцца акенца. Гэта Рутгер поркаецца ў сваёй майстэрні. Ён вынаходца. Цяпер Рутгер стаіць ля варштата і збірае новую прыладу.

Рутгеру вельмі падабаецца майстраваць.







А гэта Вальтар, малодшы брат Рутгера. Ён завіхаецца на кухні і нешта напявае сабе пад нос. Вальтар пячэ пірог і ўпрыгожвае дом да Калядаў.

— Зрабіў бы ты нейкую штуковіну, каб па гаспадарцы дапамагала! — крычыць Вальтар, каб Рутгер у сваёй майстэрні яго пачуў.





«Вось як, — разважае Рутгер, спрабуючы пачухаць спіну алоўкам. — Штуковіну, значыцца? Каб усю работу рабіла? А што, някепска. Вальтар тады адчэпіцца, і я буду спакойна сабе вынаходзіць». Рутгер хуценька бярэцца за справу.

Ён працуе ўвесь дзень і ўсю ноч. І вось нарэшце вынаходка гатовая. Рутгер ідзе на кухню, каб паказаць яе Вальтару.

— Глядзі! — кажа ён. — Я зрабіў!

— Што гэта? — пытаецца Вальтар.

— Твой Памагатар! — адказвае Рутгер задаволена.

Экран на Памагатары слаба міргае.

— Памагатар… — мармыча апарат.

— Ой! — уздрыгвае Вальтар. — Яно размаўляе!

— Я дык нічога не чую, — адказвае Рутгер.







Рутгер тлумачыць, як працуе Памагатар і што ён умее рабіць.

— Давай паставім яго сюды, да акна. У гэтай штуковіны на баку — сонечная батарэя. Кеміш?

Вальтар разглядае Памагатара, а потым вяртаецца да ракавіны з гарой нямытых талерак.

— Як добра, — кажа Вальтар брату. — Мабыць, мне больш не давядзецца гатаваць і мыць посуд.

Але Рутгер не адказвае. Ён ужо вышмыгнуў з кухні і пабег у майстэрню, да свайго варштата.